ДА 50-ГОДДЗЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

# ДРУГОЙ СТАЛА ВЁСКА

Аб тым, якой была вёска Баханы раней і якой стала цяпер, расказвае 73-гадовы пенсіянер Мікіта Сямёнавіч Аўчыннікаў.

—Цяжка ўспамінаць тыя змрочныя гады. Хоць працавалі ад цямна да цямна, але не цалкам спажывалі плады сваёй працы хлебаробы. Большая частка іх даставалася памешчыкам і багацеям. Лічаныя людзі былі ў вёсцы, якія мелі невялікія надзелы зямлі, а наконт вучобы, то і размовы не было. Некалькі чалавек закончылі толькі царкоўна-прыхадскую школу. Амаль усе жыхары вёскі жылі ў нястачы. Саламяныя стрэхі, пакасіўшыяся вокны ў дамах, брудная вуліца, газнічкі вечарамі—вось якой вёскай былі Баханы.

А прайдзіцеся па вуліцах зараз. З кожным годам узводзяцца новыя дамы, дахі якіх крыюць шыферам, шчапой. Толькі ў гэтым годзе справілі наваселлі ў новых дамах хлебаробы Васіль Антоненка, Піліп Яненка, Андрэй Савосценка, Апанасся Зубачова і іншыя. Забудовы вядуцца планава.

Непазнавальным, заможным стала жыццё хлебаробаў. У дамах калгаснікаў ярка гараць лямпачкі Ільіча. Многія набылі на ўласныя сродкі пральныя машыны, электрычныя прасы. А ў Д. Галянкова, П. Рабцава над дамамі ўзняліся тэлевізійныя антэны.

У вёсцы ёсць добры клуб, у якім кожны дзень дэманструюцца кінафільмы і нярэдка наладжваюцца канцэрты мастацкай самадзейнасці. Хлебаробы калгаса часта слухаюць даклады мясцовых настаўнікаў на разнастайныя тэмы. Цяпер у нас сярэдняя школа, дзе 310 навучэнцаў бясплатна авалодваюць ведамі. Выраслі ў Баханах спецыялісты розных спецыяльнасцей: настаўнікі, медыцынскія работнікі, механізатары шырокага профілю. А колькі людзей атрымалі вышэйшую адукацыю! Пётр Андрэевіч Андрэйчыкаў паспяхова закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію і застаўся там выкладчыкам. Не так даўно ён стаў кандыдатам тэхнічных навук. У адным з інстытутаў горада Бранска працуе выкладчыкам гісторыі Іван Яўціхавіч Яненка. Ёсць і фельчарска-акушэрскі пункт, дзе жыхары атрымліваюць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. У цэнтры вёскі ў хуткім часе пачнецца будаўніцтва новага магазіна на чатыры рабочых месцы. Амаль у кожны дом штодзённа паштальён дастаўляе газеты і часопісы. Заканчваецца ў вёсцы будаўніцтва майстэрні па бытавому абслугоўванню. Жыхары будуць мець магчымасць пашыць сабе на месцы добрую сукенку, боты.

Амаль у кожным доме ёсць добрая мэбля, веласіпеды, а ў механіка Івана Прахарэнкі, калгасніка Ягора Сідорына, у памочніка брыгадзіра Рыгора Будзянкова, настаўніка Аляксея Басава ёсць уласныя матацыклы.

—Усё гэта дала нам Савецкая ўлада, — зазначае М. С. Аўчыннікаў. — Хочацца яшчэ жыць і жыць.

**М. Афанас'еў.**

**Афанас'еў, М. Другой стала вёска** : да 50-годдзя Савецкай Беларусі / М. Афанас'еў // Шлях Кастрычніка. — 1967.
*Вёска Баханы Хоцімскага раёна.*